# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

8 лістапада 2017 г. №42 (426)




стар. 3

**Змены ў пенсійным заканадаўстве**



стар. 6

**Што прагназуе гродзенскі прадпрымальнік?**



стар. 8

**Пра электрыкаў, якіх не выклікалі**

ТЭМА ТЫДНЯ

# БІЗНЕС ПА НОВЫХ ПРАВІЛАХ

## Як улада дапаможа развіццю прадпрымальніцтва?




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**С А студзеня пачне працаваць пакет дакументаў па разнявoленні бізнесу. Кіраўнік дзяржавы падпісаў ужо амаль усе яго складнікі. Прычым Аляксандр Лукашэнка вельмі ўважліва падышоў да гэтай тэмы. Першая вялікая нарада — з удзелам высокіх службовых асоб, бізнесменаў, кіраўнікоў зацікаўленых грамадскіх арганізацый — прайшла яшчэ ў лютым. А ў пачатку жніўня Прэзідэнт заслухаў даклад, прысвечаны выкананню яго даручэнняў. На працягу наступных месяцаў кіраўнік краіны правёў шэраг рабочых сустрэч, падчас якіх дэтальна абмеркаваў нюансы кожнага з дакументаў па разнявoленні дзелавой ініцыятывы.**

стар. 4

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ!

# СПРАВАЙ ПАВІННЫ ЗАЙМАЦЦА НЕ ДЫЛЕТАНТЫ, А СПЕЦЫЯЛІСТЫ

## Дэпутаты Бабруйскага і Чэрыкаўскага раёнаў пра тое, ці павінны сельвыканкамы адказваць за ўсё і якіх законаў нам не хапае

**Сёння ўмовы жыцця ў сельскай мясцовасці цалкам залежаць ад эфектыўнай работы сельвыканкамаў. На іх плячах не толькі адміністрацыйныя працэдуры, пытанні добраўпарадкавання, абслугоўвання інфраструктуры населеных пунктаў. Але яшчэ і назіральныя камісіі, якія павінны працаваць нават з тымі грамадзянамі (калі яны здзейснілі правапарушэнне), якія не прапісаны ў сельсавеце, саветы грамадскіх пунктаў аховы правапарадку (СГПАП), якія займаюцца перавыхаваннем часам відавочна неадэкватных грамадзян, маніторынг і ўлік вулічнага асвятлення. Гэта, канешне, таксама важна. Але, як сведчаць дэпутаты, ёсць моманты, якія перашкаджаюць наладзіць эфектыўную работу. Па-сутнасці, дылетантам прыходзіцца вырашаць часам зусім далёкія ад іх пытанні. У выніку якасць кульгае, нерацыянальна выдаткоўваюцца бюджэтныя грошы. І з гэтым трэба нешта рабіць, сігналізуюць народныя абраннікі.**

### ЛЯМПАЧКІ ЎКЛЮЧАЕМ, ПАКАЗАННІ ЗНІМАЕМ

Для пачатку звернемся да Пастановы Міністэрства энергетыкі Рэспублікі Беларусь ад 30.01.2008 №2 «Аб зацвярджэнні Тыпавога палажэння аб парадку правядзення арганізацыйна-тэхнічных мерапрыемстваў па міжрамонтным абслугоўванні сетак вонкавага асвятлення сельскіх населеных пунктаў», якой павінны кіравацца ў сваёй рабоце сельвыканкамы.

стар. 7




Старшыня Бабруйскага райсавета дэпутатаў Аляксандр ЕМЯЛЬЯНАЎ.